ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы
адукацыі “Гомельскі
дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”
С.А. Хахомаў
2017

# КРЫТЭРЫІ
## ацэнкі ведаў абітурыентаў па беларускай літаратуры на ўступных экзаменах 2017 года

Уступны экзамен па беларускай літаратуры праводзіцца ў пісьмовай форме па заданнях, складзеных на падставе праграмы ўступных экзаменаў для паступаючых ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, на 2017 г. (Праграма зацверджана загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.10.2016 № 847).

На ўступных іспытах абітурыент павінен в е д а ц ь:

– асноўныя этапы і заканамернасці развіцця беларускай літаратуры (ад старажытных часоў да сучаснасці);

– сутнасць і характэрныя асаблівасці асноўных літаратурных эпох і напрамкаў (барока, класіцызм, асветніцтва, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм), родаў і жанраў літаратуры;

– найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, творчасць якіх вывучаецца манаграфічна;

– змест, праблематыку, сістэму вобразаў, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў, якія ў агульнаадукацыйных установах вывучаліся тэкстуальна, іх канкрэтна-гістарычнае нацыянальнае і агульначалавечае значэнне;

– неабходны мінімум звестак па тэорыі літаратуры, патрэбных для аналізу і ацэнкі мастацкіх твораў (змест і форма; сюжэт, кампазіцыя, тэматыка, праблематыка, пафас твора); адметнасці паэзіі і прозы як асноўных відаў (тыпаў) літаратурнай творчасці; асноўныя паняцці вершаскладання (рытм, рыфма, страфа, вершаваны памер).

Абітурыент павінен у м е ц ь:

– даваць ідэйна-эстэтычную ацэнку прачытаным творам і абгрунтоўваць яе;

– выяўляць характэрныя родавыя і жанравыя, стылёвыя асаблівасці вывучаных твораў;

– аналізаваць сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці вывучаных твораў, характарызаваць герояў эпічных і драматычных твораў, а таксама вызначаць важнейшыя адметнасці лірычных герояў тых твораў, якія вывучаліся тэкстуальна;

– выяўляць асноўныя адметнасці творчай індывідуальнасці і стылю пісьменніка;

– суадносіць канкрэтныя з’явы нацыянальнай літаратуры з асноўнымі эпохамі і напрамкамі сусветнага літаратурнага працэсу;

– перадаваць блізка да тэксту або цытаваць урыўкі з твораў, якія прапанаваны школьнай праграмай для завучвання на памяць.

Пісьмовы экзамен па беларускай літаратуры прадугледжвае выкананне заданняў пяці ўзроўняў.

Заданні 1 – 3 узроўняў выяўляюць ступень разумення мастацкага твора, веданне яго кампазіцыі, сістэмы вобразаў. Шэраг заданняў накіраваны на

вывучэнне паэтыкі, жанру і стылю твора. Выкананне заданняў прадугледжвае правільны выбар аднаго ці некалькіх з прапанаваных адказаў або кароткі самастойны адказ.

Заданні 4 – 5 узроўняў вызначаюць здольнасць арыентавацца ў праблемных пытаннях гісторыі літаратуры і выяўляюць самастойнасць пазіцыі экзаменуемага. Такія заданні прадугледжваюць аргументаваныя адказы без указання магчымых варыянтаў.

Напрыклад:

| | | |
|---|---|---|
| *1 узро-вень* | *У чыёй сям'і знаходзіўся Алесь Загорскі (раман У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім") на дзядзькаванні?* | *1. Раўбічаў*<br>*2. Кагутоў*<br>*3. Хадансхіх*<br>*4. Каліноўскіх* |
| *2 узро-вень* | *Якому аўтару належыць зборнік "Дудар беларускі"?* | *1. Я. Чачоту*<br>*2. Я. Лучыну*<br>*3. А. Гурыновічу*<br>*4. В. Дуніну-Марцінкевічу* |
| *3 узро-вень* | Устанавіце адпаведнасць твора аўтару. Адказ запішыце ў выглядзе злучэння лічбаў і літар.<br>**1** "Знак бяды" **А** Якуб Колас<br>**2** "На ростанях" **Б** Васіль Быкаў<br>**3** "Раскіданае гняздо" **В** Кузьма Чорны<br>**4** "Пошукі будучыні" **Г** Янка Купала | |
| *4 уз-ровень* | Асаблівасці кампазіцыі аповесці В. Быкава "Знак бяды" | |
| *5 уз-ровень* | Тэматыка і праблематыка вершаў А. Гаруна (на прыкладзе канкрэтных твораў) | |

У пісьмовай рабоце прадугледжана выкананне 21 задання:

| **узровень** | **нумары заданняў** | **колькасць балаў** | **усяго** |
|---|---|---|---|
| Першы (рэцэптыўны) | 1 – 5 | 0,3 балы за заданне | 1,5 |
| Другі (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны) | 6 – 13 | 0,4 балы за заданне | 3,2 |
| Трэці (рэпрадуктыўна-прадуктыўны) | 14 – 18 | 0,5 бала за заданне | 2,5 |
| Чацвёрты (прадуктыўны) | 19 – 20 | 0,9 бала за заданне | 1,8 |
| Пяты (прадуктыўны, творчы) | 21 | 1 бал за заданне | 1 |

Усяго 10 балаў

Пры наяўнасці памылак у пісьмовым афармленні адзнака можа быць зніжана на 1-2 балы. Нуль балаў выстаўляецца, калі абітурыент не выканаў правільна ніводнага задання. Мінімальная станоўчая адзнака – 3 балы.

На выкананне пісьмовай работы адводзіцца 240 мінут.

Старшыня прадметнай камісіі З.У. Шведава, к.ф.н., дацэнт

УТВЕРЖДАЮ
Ректор учреждения
образования “Гомельский
государственный университет
имени Франциска Скорины”
С.А. Хахомов
2017

# КРИТЕРИИ
## оценки знаний абитуриентов по русской литературе на вступительных экзаменах 2017 года

Вступительные испытания по русской литературе проводятся в письменной форме по заданиям, составленным в соответствии с программой вступительных испытаний для поступающих в учреждения, обеспечивающие получение высшего образования в Республике Беларусь, на 2017 г. (Программа утверждена приказом Министерства образования Республики Беларусь от 28.10.2016 № 847).

На вступительном испытании по русской литературе абитуриент должен з н а т ь:

– тексты произведений, изучение которых предусмотрено учебной программой по русской литературе для общеобразовательных учреждений, их идейное содержание и художественные особенности;

– художественное, историческое и общественное значение литературного произведения в связи с общественно-политической обстановкой эпохи;

– общие закономерности историко-литературного процесса, роль автора произведения в развитии литературы;

– важнейшие биографические сведения о писателях;

– специфику литературы как искусства слова.

Абитуриент должен у м е т ь анализировать художественное произведение в единстве содержания и художественной формы.

Абитуриент должен обладать следующими знаниями и умениями, связанными с теоретико-литературными понятиями, представленными в учебной программе по русской литературе для общеобразовательных учреждений:

– основные роды художественных произведений (эпос, лирика, драма) и главные их жанры;

– основные литературные направления – классицизм, романтизм, реализм, модернизм (общее понятие);

– тема, идея, композиция, конфликт, сюжет произведения;

– художественный образ, литературный тип, лирический герой;

– сатира, юмор, гротеск;

– эпитет, метафора, сравнение, антитеза, гипербола;

– основные стихотворные размеры (ямб, хорей, дактиль, амфибрафий, анапест);

– силлабо-тоническая и тоническая системы стихосложения.

Письменный экзамен по русской литературе предусматривает выполнение заданий пяти уровней.

Задания 1 – 3 уровней включают вопросы, помогающие определить степень владения историко-литературным материалом, выявить уровень понимания художественного произведения, знание его композиции, системы образов. Ряд

заданий направлен на изучение поэтики, жанра и стиля произведения. Выполнение заданий предусматривает правильный выбор одного или нескольких из предложенных ответов либо краткий самостоятельный ответ.

Задания 4 – 5 уровней определяют способность ориентироваться в проблемных вопросах истории литературы и выявляют самостоятельность позиции экзаменуемого. Такие задания предусматривают аргументированные ответы без указания возможных вариантов.

Например:

| | | |
|---|---|---|
| *1 уровень* | Строгая иерархия жанров характерна для: | 1. Реализма<br>2. Классицизма<br>3. Романтизма |
| *2 уровень* | Кто из литературных героев произносит фразу: *“Человек! Это великолепно! Это звучит… гордо!”* | 1. Печорин<br>2. Петя Трофимов<br>3. Раскольников<br>4. Сатин |
| *3 уровень* | Определите стихотворный размер:<br>*Сижу за решёткой в темнице сырой.*<br>*Вскормлённый неволей орёл молодой,*<br>*Мой грустный товарищ, махая крылом,*<br>*Кровавую пищу клюёт под окном.* | |
| *4 уровеь* | Основная тема пьесы А. Чехова “Вишнёвый сад”. | |
| *5 уровень* | Поэтическое новаторство В. Маяковского (на примере конкретных произведений). | |

В письменной работе предусмотрено выполнение 21 задания:

| **уровень** | **номера заданий** | **количество баллов** | **всего** |
|---|---|---|---|
| Первый (рецептивный) | 1 – 5 | 0,3 балла за задание | 1,5 |
| Второй (рецептивно-репродуктивный) | 6 – 13 | 0,4 балла за задание | 3,2 |
| Третий (репродуктивно-продуктивный) | 14 – 18 | 0,5 балла за задание | 2,5 |
| Четвёртый (продуктивный) | 19 – 20 | 0,9 балла за задание | 1,8 |
| Пятый (продуктивный, творческий) | 21 | 1 балл за задание | 1 |

Всего 10 баллов

При наличии ошибок в письменном оформлении работы оценка может быть снижена на 1-2 балла. Ноль баллов выставляется, если абитуриент не выполнил правильно ни одного задания. Минимальная положительная оценка – три балла.

На выполнение письменной работы отводится 240 минут.

Председатель предметной комиссии З.В. Шведова, к.ф.н., доцент

УТВЕРЖДАЮ
Ректор учреждения
образования “Гомельский
государственный университет
имени Франциска Скорины”
С.А. Хахомов
2017

**КРИТЕРИИ**
**оценки знаний абитуриентов по русскому (белорусскому) языку на вступительных экзаменах 2017 года**

Вступительный экзамен по русскому или белорусскому языку проводится в письменной форме по экзаменационным заданиям, составленным в соответствии с программой вступительных испытаний для поступающих в учреждения, обеспечивающие получение высшего образования в Республике Беларусь, на 2017 г. (Программа утверждена приказом Министерства образования Республики Беларусь от 28.10.2016 № 847).

При оценке выполнения письменных заданий используются следующие критерии.

Абитуриенту предлагается 3 задания (2 теоретических и 1 практическое). Ноль баллов ставится, если абитуриент не выполнил правильно ни одного задания или отказался от их выполнения. Каждое из двух первых (теоретических) правильно выполненных заданий оценивается в 3 балла. Правильно выполненное третье (практическое) задание оценивается в 4 балла. Всего абитуриент может набрать 10 баллов. Минимальная положительная оценка – три балла.

На выполнение письменной работы отводится 240 минут.

Председатель предметной комиссии З.В. Шведова, к.ф.н., доцент

УТВЕРЖДАЮ
Ректор учреждения
образования “Гомельский
государственный университет
имени Франциска Скорины”
С.А. Хахомов
2017

**КРИТЕРИИ**
**оценки знаний абитуриентов по методике преподавания русского языка и методике обучения литературному чтению на вступительных экзаменах 2017 года**

Вступительные испытания по методике преподавания языка и методике обучения литературному чтению проводятся в письменной форме по заданиям, составленным в соответствии с программой вступительных испытаний для выпускников учреждений среднего специального образования, поступающих на сокращенный срок получения образования, на 2017 г.

На вступительном испытании по методике преподавания языка и методике обучения литературному чтению абитуриент должен з н а т ь:

- цель, задачи, принципы обучения русскому языку младших школьников; структуру и содержание программы и учебников по русскому языку для начальной школы; методы и приемы обучения русскому языку младших школьников; классификацию типов уроков русского языка в начальной школе, основные требования к урокам русского языка; содержание и методику обучения грамоте; содержание и методику работы по развитию речи на уроках русского языка в начальной школе; требования к базовому и повышенному уровню подготовки учеников начальной школы по литературному чтению; особенности восприятия литературного произведения учениками младших классов; этапы и формы организации учебной деятельности на уроках литературного чтения; пути анализа литературного произведения; методы и приемы формирования механизма и качества чтения, способов понимания прочитанного, навыков самостоятельной работы с книгой, методы и приемы развития творческих способностей и мышления учащихся.

Абитуриент должен у м е т ь

- планировать работу по русскому языку в начальной школе; применять новые педагогические технологии на уроках русского языка; анализировать типичные графические ошибки учащихся и предупреждать их; владеть современными методами обучения детей грамоте, основам фонетики и графики, изучения состава слова и элементов словообразования, морфологии, синтаксиса и пунктуации, орфографии; формировать у учащихся умение анализировать текст; классифицировать и предупреждать ошибки в письменных работах учащихся; организовывать и анализировать педагогическую деятельность в области литературного образования;

разрабатывать и проводить различные по форме занятия, наиболее эффективные при изучении соответствующих тем и разделов программы по чтению для 1-4 классов, адаптируя их к различным уровням подготовки учащихся; анализировать учебную и учебно-методическую литературу по чтению и использовать ее для собственной профессиональной деятельности; правильно организовывать читательскую деятельность учащихся, управлять ею и оценивать ее результаты; владеть современными методами обучения детей первоначальным навыкам чтения и его совершенствования; приёмами адаптации анализа литературного произведения к условиям работы в начальной школе; приёмами организации учебной деятельности младших школьников по освоению программы литературного чтения; средствами диагностики и совершенствования литературного образования младших школьников; демонстрировать способность и готовность: к литературно-образовательной и культурно-просветительской работе с детьми младшего школьного возраста и их родителями в учреждениях разного типа.

Письменный экзамен по методике преподавания языка и методике обучения литературному чтению предусматривает выполнение заданий трех уровней.

Первый уровень состоит из 10 заданий, второй уровень – из 5, третий уровень – из 5.

В письменной работе предусмотрено выполнение 20 заданий:

| **уровень** | **номера заданий** | **количество баллов** | **всего** |
|---|---|---|---|
| Первый (рецептивно-репродуктивный) | 1 – 10 | 0,3 балла за задание | 3 |
| Второй (продуктивный) | 11 – 15 | 0,6 балла за задание | 3 |
| Третий (продуктивный, творческий) | 16 – 20 | 0,8 балла за задание | 4 |

Всего 10 баллов

При наличии ошибок в письменном оформлении работы оценка может быть снижена на 1-2 балла. Ноль баллов выставляется, если абитуриент не выполнил правильно ни одного задания. Минимальная положительная оценка – три балла.

На выполнение письменной работы отводится 240 минут.

Председатель предметной комиссии З.В. Шведова, к.ф.н., доцент

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы
адукацыі “Гомельскі
дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”
С.А. Хахомаў
2017

**КРЫТЭРЫІ**
**ацэнкі ведаў абітурыентаў па методыцы выкладання беларускай мовы і методыцы навучання літаратурнаму чытанню на ўступных экзаменах 2017 года**

Уступны экзамен па методыцы выкладання мовы і методыцы навучання літаратурнаму чытанню праводзіцца ў пісьмовай форме па заданнях, складзеных на падставе праграмы ўступных экзаменаў для выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія паступаюць на скарочаны тэрмін атрымання адукацыі, на 2017 г.

На ўступных іспытах абітурыент павінен в е д а ц ь:

- мэту, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы навучання беларускай мове і літаратуры малодшых школьнікаў; формы арганізацыі вучэбнай і пазакласнай работы па беларускай мове; класіфікацыю тыпаў урокаў беларускай мовы ў пачатковай школе, асноўныя патрабаванні да іх; планаванне работы па беларускай мове ў пачатковай школе; развіццёвыя магчымасці прадмета “Беларуская мова”, яго выхавальнае значэнне; змест і методыку навучання грамаце; змест і методыку работы па вывучэнні фанетыкі і графікі, складу слова і элементаў словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу і пунктуацыі, арфаграфіі; змест і методыку работы па развіцці маўлення на ўроках беларускай мовы ў пачатковай школе; спецыфіку ўспрымання мастацкіх твораў малодшымі школьнікамі; этапы і формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці на ўроках літаратурнага чытання; шляхі аналізу літаратурнага твора; метады і прыёмы фарміравання механізму і якасці чытання, спосабаў разумення прачытанага, навыкаў самастойнай работы з кнігай; метады і прыёмы развіцця творчых здольнасцей і мыслення вучняў.

Абітурыент павінен умець:

- планаваць працу па беларускай мове ў пачатковай школе; выкарыстоўваць новыя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы; аналізаваць тыповыя графічныя памылкі вучняў і папярэджваць іх; валодаць сучаснымі метадамі навучання дзяцей грамаце, асновам фанетыкі і графікі, вывучэння складу слова і элементаў словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу і пунктуацыі, арфаграфіі; фарміраваць у вучняў уменне аналізаваць тэкст; класіфікаваць і папярэджваць памылкі ў пісьмовых працах вучняў; фарміраваць пазнаваўчую актыўнасць вучняў, іх маральныя і этычныя якасці ў працэсе вывучэння роднай мовы; фарміраваць камунікатыўную культуру малодшых школьнікаў; развіваць практычныя ўменні і навыкі правільнага ўжывання беларускай мовы; узбагачаць слоўнікавы запас вучняў,

фарміраваць засваенне вымаўленчых нормаў, правілаў правапісу, авалоданне каліграфічнымі навыкамі; арганізоўваць і аналізаваць педагагічную дзейнасць у галіне літаратурнай адукацыі; аналізаваць вучэбную і вучэбна-метадычную літаратуру па чытанні і выкарыстоўваць яе для ўласнай прафесійнай дзейнасці; правільна арганізоўваць чытацкую дзейнасць вучняў, кіраваць ёю і ацэньваць яе вынікі; валодаць сучаснымі метадамі навучання дзяцей першапачатковым навыкам чытання і яго ўдасканаленню; прыёмамі адаптацыі аналізу літаратурнага твора да ўмоў работы ў пачатковай школе; прыёмамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў па засваенні праграмы літаратурнага чытання; сродкамі дыягностыкі і ўдасканалення літаратурнай адукацыі малодшых школьнікаў; дэманстраваць здольнасці і жаданне да літаратурна-адукацыйнай і культурна-асветніцкай работы з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту і іх бацькамі ва ўстановах рознага тыпу.

Пісьмовы экзамен па методыцы выкладання мовы і методыцы навучання літаратурнаму чытанню прадугледжвае выкананне заданняў трох узроўняў.

Першы ўзровень складаецца з 10 заданняў, другі ўзровень – з 5, трэці ўзровень – з 5.

У пісьмовай рабоце прадугледжана выкананне 20 заданняў:

| **узровень** | **нумары заданняў** | **колькасць балаў** | **усяго** |
|---|---|---|---|
| Першы (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны) | 1 – 10 | 0,3 балы за заданне | 3 |
| Другі (прадуктыўны) | 11 – 15 | 0,6 балы за заданне | 3 |
| Трэці (прадуктыўны, творчы) | 16 – 20 | 0,8 бала за заданне | 4 |

Усяго 10 балаў

Пры наяўнасці памылак у пісьмовым афармленні адзнака можа быць зніжана на 1-2 балы. Нуль балаў выстаўляецца, калі абітурыент не выканаў правільна ніводнага задання. Мінімальная станоўчая адзнака – 3 балы.

На выкананне пісьмовай работы адводзіцца 240 мінут.

Старшыня прадметнай камісіі З.У. Шведава, к.ф.н., дацэнт